**ДУК “Талачынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аболецкая сельская бібліятэка-філіял № 36**

# “З БЕЛАРУСКАЙ КНІГАЙ У БУДУЧЫНЮ”
**Бібліятэчны праект**

**Назва праекта:** “З беларускай кнігай у будучыню”.

**Напрамак дзейнасці:** папулярызацыя нацыянальнай культуры, мовы, літаратуры.

**Актуальнасць бібліятэчнага праекта:**

На працягу трох гадоў у бібліятэцы рэалізоўваўся дадзены праект. У рамках праекта арганізоўваліся тэматычныя і персанальныя выставы да юбілеяў знакамітых пісьменнікаў, ладзіліся літаратурныя вечарыны і агляды літаратуры, паэтычныя гадзіны і шмат іншых мерапрыемстваў, якія наведвалі вучні мясцовай школы разам з сваімі настаўнікамі.

У мінулым годзе праводзімыя мерапрыемствы па рэалізацыі праекта таксама карысталіся попытам сярод юных чытачоў бібліятэкі, таму было прынята рашэнне прадоўжыць рэалізацыю дадзенага праекта ў 2024 годзе.

Праграма па прыцягненню да чытання беларускай кнігі дзяцей, падлеткаў і моладзі “З беларускай кнігай ў будучыню” – гэта цыкл мерапрыемстваў сумесна з адукацыйнымі ўстановамі, ў супольніцтве з іншымі суб’ектамі адукацыйна-культурнага соцыума зоны абслугоўвання.

**Мэта праекта:**

Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці дзяцей і падлеткаў і спасціжэння імі нацыянальнай літаратурнай спадчыны. Абуджэнне цікавасці і любві да беларускай мастацкай кнігі.

**Задачы праекта:**

- папулярызацыя беларускай кнігі;
- выхаванне мастацкага густу і эстэтычнай культуры, патрыятызму і нацыянальнай свядомасці;
- паляпшэнне паказчыкаў работы бібліятэкі ў сувязі з папулярызацыяй чытання і арганізацыяй дасугавых мерапрыемстваў у бібліятэцы.

**Мэтавая аўдыторыя:**

Дзеці і падлеткі ад 10 да 16 гадоў.

**Тэрмін рэалізацыі праекта:**

2024 год.

**Партнёры праекта:**

ДУА “Аболецкая дзіцячы сад – базавая школа”;

Аболецкі Дом фальклору ДУК “Талачынскі цэнтр культуры і народнай творчасці”.

**Чакаемые вынікі праекта:**

- максімальнае і аператыўнае забяспячэнне інфармацыйных запатрабаванняў карыстальнікаў кнігамі беларускіх аўтараў;
- прывабліванне ў бібліятэку новых карыстальнікаў;
- рост колькасці карыстальнікаў, чытаючых на роднай мове.

**План рэалізацыі праекта на 2024 год**

| № | Форма і назва мерапрыемства | Тэрмін выканання |
|---|---|---|
| | ***Тэматычныя и кніжныя выставы*** | |
| 1. | Выстава-каляндар “Літаратурныя юбілеі – 2024” | студзень |
| 2. | Выстава-парада “Беларуская кніга – гэта цікава!” | люты |
| 3. | Выстава-партрэт “Класік беларускай паэзіі” (да 110-годдзя з дня нараджэння А.Куляшова) | люты |
| 4. | Выстава-знаёмства “Паэт і празаік Васіль Жуковіч” (да 85-годдзя з дня нараджэння пісьменніка) | верасень |
| | ***Мерапрыемствы*** | |
| | ***Да юбілейных дат беларускіх пісьменнікаў*** | |
| 1. | Літаратурны вечар “І сэрцам песню праспяваць…” (да 95-годдзя з дня нараджэння Е. Лось) | сакавік |
| 2. | Паэтычна-музычная гасцёўня “Таямнічая планета паэта Уладзіміра Мазго” (да 65-годдзя з дня нараджэння У. Мазго) | сакавік |
| 3. | Вечар-партрэт “Заўсёды ў памяці народнай” (да 100-годдзя з дня нараджэння В.Быкава) | чэрвень |
| 4. | Літаратурная гадзіна “Янка-парашутыст, ваяка Мішка і Міколка-паравоз” (да 125-годдзя з дня нараджэння М.Лынькова) | лістапад |
| | ***Да юбілейных дат дзеячоў беларускай культуры (мастакоў, музыкантаў, тэатральных дзеячаў і інш.)*** | |
| 5. | Літаратурна-музычны вечар “А песня будзе жыць…” (да 55-годдзя з дня заснавання ансамбля “Песняры”) | верасень |
| | ***Да Дня роднай мовы*** | |
| 6. | Акцыя “Размаўляем па-беларуску” | люты |

| | | |
|---|---|---|
| ***Да Дня беларускага пісьменства і друку*** | | |
| 7. | Інфарміна “Пад небам беларускага пісьменства” | верасень |
| ***Выдавецкая дзейнасць*** | | |
| 1. | Цыкл інфармацыйных буклетаў-закладак “Пісьменнікі Віцебшчыны – юбіляры 2024 года” | на працягу года |
| 2. | Інфармацыйны буклет “Беларускія кнігі – юбіляры 2024 года” | студзень |

Бібліятэкар Аболецкай
бібліятэкі-філіяла № 36 А.А. Піхцерава